# Стандарты абароны дзяцей
# ад неналежнага абыходжання
# ў Асацыяцыі імя Станіслава Бжазоўскага

(далей — **«Стандарты»**)

Варшава, 4 лістапада 2024 г.

# Змест:

*I. Прэамбула*
*II. Тэрміны і азначэнні*
*III. Стандарты, прынятыя ў Асацыяцыі:*

1. Праверка суіскальні:ц
2. Працаўладкаванне і праверка падрадчы:ц Асацыяцыі
3. Абавязкі персаналу
4. Адносіны персаналу з дзецьмі
5. Фізічны кантакт
6. Камунікацыя з дзіцем
7. Адносіны паміж дзецьмі
8. Ахова персанальных даных
9. Ахова выявы
10. Карыстанне электроннымі прыладамі і інтэрнэтам
11. Прынцыпы дзеянняў і працэдуры ў выпадках неналежнага абыходжання з дзецьмі
12. Умяшанне ў выпадку выяўлення розных форм неналежнага абыходжання з дзецьмі
13. Неналежнае абыходжанне з дзіцем з боку дарослага
14. Неналежнае абыходжанне з дзіцем з боку іншага дзіцяці
15. Занядбанне дзіцяці ў сямейным асяроддзі
16. Абавязак захавання канфідэнцыйнасці
17. Прынцыпы вядзення і захоўвання дакументацыі
18. Забеспячэнне доступу да тэкста Стандартаў
19. Перагляд і абнаўленне Стандартаў
20. Забеспячэнне выканання палажэнняў Стандартаў персаналам

*IV. Дадаткі*

*I. Прэамбула*

Галоўным прынцыпам любой дзейнасці, якая ажыццяўляецца персаналам Асацыяцыі імя Станіслава Бжазоўскага, з’яўляецца дзейнасць на карысць дзіцяці і ў яго найлепшых інтарэсах. Кожная асоба, якая ўступае ў кантакт з дзіцем, павінна ставіцца да яго з павагай і ўлічваць яго патрэбы. Ужыванне гвалту ў любой форме з боку любой асобы ў адносінах да дзіцяці непрымальнае. Імкнучыся да дасягнення вышэйзгаданых мэт, супрацоўні:цы абавязваюцца дзейнічаць у адпаведнасці з бягучым заканадаўствам, унутранымі дакументамі Асацыяцыі, у тым ліку палажэннямі гэтых Стандартаў, а таксама ў межах сваёй кампетэнцыі.

*II. Тэрміны і азначэнні*

1. **Асацыяцыя** — Асацыяцыя імя Станіслава Бжазоўскага, зарэгістраваная па адрасе: вул. Ясна, д. 10, пам. 3, 00-013 Варшава, KRS 0000242083, REGON 140369159, NIP 701-000-25-99.
2. **Дзіця** — любы чалавек ва ўзросце да 18 гадоў.
3. **Дарослы** — любы чалавек, які дасягнуў 18 гадоў.
4. **Апякун:ка дзіцяці** — асоба, якая мае права прадстаўляць дзіця, у прыватнасці, законн:ая прадстаўні:ца дзіцяці: бацька/маці, законн:ая апякун:ка або іншая асоба, якая мае права на прадстаўніцтва на падставе спецыяльных палажэнняў або рашэння суда, у тым ліку прыёмная сям’я.
5. **Супрацоўні:ца** — любая фізічная асоба, якая працуе ў Асацыяцыі імя Станіслава Бжазоўскага на падставе працоўнага ці грамадзянска-прававога дагавора, а таксама валанцёр:кі/практыкант:кі, якія з прычыны сваіх службовых абавязкаў ці задач маюць (могуць мець) кантакт з дзецьмі.
6. **Суіскальні:ца** — асоба, якая прэтэндуе на працу ў Асацыяцыі.
7. **Падрадчы:ца** — асоба, якая мае (можа мець) кантакт з дзіцем у кантэксце выканання асобна заключанага грамадзянска-прававога дагавора паміж гаспадарчым суб’ектам і Асацыяцыяй.
8. **Персанал** — персанал Асацыяцыі імя Станіслава Бжазоўскага ахапляе супрацоўні:ц і падрадчы:ц Асацыяцыі.
9. **Хатні гвалт** — хатні гвалт у адпаведнасці з Законам аб прадухіленні хатняга гвалту ад 29 ліпеня 2005 года (Заканадаўчы веснік за 2024 г., паз. 424 з наступнымі змяненнямі).
10. **Фізічны кантакт** — любы цялесны кантакт, дотык, пацісканне рукі, пацалункі, трыманне за рукі, паляпванне, пагладжванне, прыабдыманне за плечы і г.д.
11. **Цялеснае пакаранне —** від пакарання, накіраваны на прычыненне болю асобе шляхам прымянення да яе фізічнай сілы.
12. **Неналежнае абыходжанне з дзецьмі** — любое злачынства, учыненае супраць дзіцяці, злачынства, сведкам якога стала дзіця, а таксама дзеянне, якое не з’яўляецца злачынствам, але парушае найлепшыя інтарэсы дзіцяці.
13. **Занядбанне** — няздольнасць бацькі/маці ці законн:ай апякун:кі задаволіць асноўныя матэрыяльныя і эмацыянальныя патрэбы дзіцяці, у прыватнасці, забяспечыць яму адэкватнае харчаванне, адзежу, жыллё, медыцынскую дапамогу, бяспеку; або адсутнасць нагляду за абавязкам наведваць пачатковую школу.

14. **Інцыдэнт** — любы выпадак неналежнага абыходжання з дзіцем або сітуацыя, якая выклікае падазрэнні ў такім абыходжанні, аб якім паведамляецца ў Асацыяцыю.
15. **Злачынства** — дзеянне, забароненае пад страхам пакарання законам, які дзейнічае на момант яго здзяйснення.
16. **Рэестр асоб, якія здзейснілі злачынства сексуальнага характару** — рэестр сексуальных злачынцаў у адпаведнасці з Законам аб супрацьдзеянні здзяйсненню злачынстваў сексуальнага характару і аб абароне непаўналетніх ад 13 мая 2016 года (Заканадаўчы веснік за 2024 г., паз. 560).
17. **Падазраванае дзіця** — дзіця, адносна якога існуе дапушчэнне, што яно датычнае да неналежнага абыходжання ў адносінах да пацярпелага дзіцяці.
18. **Пацярпелае дзіця —** дзіця, якое стала ахвярай неналежнага абыходжання ў любой форме.

*III. Стандарты Асацыяцыі*

# §1
# Праверка суіскальні:ц

1. Суіскальні:ца пасады, якая прадугледжвае кантакт з дзецьмі, падае пісьмовую заяву, якая ўтрымлівае я:е асабістыя даныя, неабходныя для выканання Асацыяцыяй сваіх абавязацельстваў, прадугледжаных Законам аб супрацьдзеянні здзяйсненню злачынстваў сексуальнага характару і аб абароне непаўналетніх ад 13 мая 2016 года (Заканадаўчы веснік за 2024 г., паз. 560). Узор заявы прыводзіцца ў **Дадатку 2** да Стандартаў.
2. Перш чым уступіць у працоўныя адносіны або дапусціць суіскальні:цу да любой іншай дзейнасці, якая прадугледжвае кантакт з дзецьмі, Асацыяцыя правярае, што гэт:ая суіскальні:ца адсутнічае ў Рэестры асоб, якія здзейснілі злачынства сексуальнага характару (далей — «**Рэестр**»). Праверка Рэестра пацвярджаецца раздрукоўкай аўтаматычнай выпіскі, згенераванай сістэмай Рэестра.
3. Асоба, даныя якой утрымліваюцца ў Рэестры, не можа быць прынята на працу ў Асацыяцыю.
4. Асоба, якая прыцягваецца да выканання задач, якія прадугледжваюць кантакт з дзецьмі, абавязана прадставіць даведку з Нацыянальнага рэестра злачынцаў аб адсутнасці звестак пра здзяйсненне злачынстваў, прадугледжаных раздзеламі XIX і XXV, а таксама артыкуламі 189а і 207 Крымінальнага кодэкса ад 6 чэрвеня 1997 года (Заканадаўчы веснік за 2024 г., паз. 17 з наступнымі змяненнямі), Законам аб супрацьдзеянні наркаманіі ад 29 ліпеня 2005 года (Заканадаўчы веснік за 2023 г., паз. 1939 з наступнымі змяненнямі), або адпаведных забароненых дзеянняў, прадугледжаных заканадаўствам іншых краін. **Даведка павінна ўтрымліваць звесткі з картатэкі судзімасцей і картатэкі непаўналетніх.** Падрабязная інструкцыя па гэтым пытанні прыводзіцца ў **Дадатку 5** да Стандартаў.
5. Падрабязныя правілы прыёму на працу фізічных асоб прыводзяцца ў **Дадатку 11** да Стандартаў.

6. Калі суіскальні:ца мае грамадзянства, адрознае ад польскага, Асацыяцыя дзейнічае ў адпаведнасці з дзеючымі прававымі нормамі.
7. Асоба, якая не прадставіла даведку, названую ў п. 4 вышэй, або прадставіла даведку, якая пацвярджае судзімасць за адно з пералічаных у гэтым пункце злачынстваў, не можа быць прынята на працу ў Асацыяцыю на пасаду, якая прадугледжвае кантакт з дзецьмі.
8. Перад допускам да працы на пасадзе, якая прадугледжвае кантакт з дзецьмі, кожная супрацоўні:ца і падрадчы:ца знаёміцца са Стандартамі абароны дзяцей ад неналежнага абыходжання, прынятымі ў Асацыяцыі, і падпісвае абавязацельства іх выконваць. Узор адпаведнай заявы прыводзіцца ў **Дадатку 9** да Стандартаў.

# §2
# Працаўладкаванне і праверка падрадчы:ц Асацыяцыі

1. Працаўладкаванне падрадчы:ц Асацыяцыі ажыццяўляецца на падставе грамадзянска-прававых дагавораў, якія заключаюцца Асацыяцыяй з гаспадарчымі суб’ектамі, або на падставе рахункаў-фактур.
2. Да пачатку супрацоўніцтва, вызначанага ў п. 1 вышэй, контрагенты (гаспадарчыя суб’екты), супрацоўні:цы якіх плануюць удзельнічаць у выкананні паслуг па дагаворы, а таксама ў выпадку выканання дагавора субпадрадчыкамі, абавязаны прадставіць Асацыяцыі неабходную інфармацыю аб такіх асобах, г.зн. выпіску з **Рэестра асоб, якія здзейснілі злачынства сексуальнага характару** і даведку з **Нацыянальнага рэестра злачынцаў** аб адсутнасці даных аб здзяйсненні злачынстваў, прадугледжаных раздзеламі XIX і XXV, а таксама артыкуламі 189а і 207 Крымінальнага кодэкса ад 6 чэрвеня 1997 года (Заканадаўчы веснік за 2024 г., паз. 17 з наступнымі змяненнямі), Законам аб супрацьдзеянні наркаманіі ад 29 ліпеня 2005 года (Заканадаўчы веснік за 2023 г., паз. 1939 г. з наступнымі змяненнямі), або адпаведных забароненых дзеянняў, прадугледжаных заканадаўствам іншых краін. Даведка павінна ўтрымліваць звесткі з картатэкі судзімасцей і картатэкі непаўналетніх.
3. Люб:ая падрадчы:ца, за выключэннем названых у п. 2 вышэй, якую плануецца наняць для выканання задач, якія прадугледжваюць кантакт з дзецьмі, абавязана да пачатку супрацоўніцтва з Асацыяцыяй прадставіць даведку з Нацыянальнага рэестра злачынцаў аб адсутнасці звестак пра здзяйсненне злачынстваў, прадугледжаных раздзеламі XIX і XXV, а таксама артыкуламі 189а і 207 Крымінальнага кодэкса ад 6 чэрвеня 1997 года (Заканадаўчы веснік за 2024 г., паз. 17 з наступнымі змяненнямі), Законам аб супрацьдзеянні наркаманіі ад 29 ліпеня 2005 года (Заканадаўчы веснік за 2023 г., паз. 1939 з наступнымі змяненнямі), або адпаведных забароненых дзеянняў, прадугледжаных заканадаўствам іншых краін. Даведка павінна ўтрымліваць звесткі з картатэкі судзімасцей і картатэкі непаўналетніх.
4. Люб:ая падрадчы:ца, за выключэннем названых у п. 2 вышэй, якую плануецца наняць для выканання задач, якія прадугледжваюць кантакт з дзецьмі, да пачатку супрацоўніцтва з Асацыяцыяй падлягае праверцы па **Рэестры асоб, якія здзейснілі**

**злачынства сексуальнага характару**. Праверка рэестра пацвярджаецца раздрукоўкай аўтаматычнай выпіскі, згенераванай сістэмай Рэестра.

5. Асацыяцыя абавязваецца праверыць сапраўднасць выпісак з дакументаў, названых у пп. 2 і 3 вышэй.
6. Калі падрадчы:ца мае грамадзянства, адрознае ад польскага, Асацыяцыя дзейнічае ў адпаведнасці з дзеючымі прававымі нормамі.
7. Дагаворы, якія заключаюцца з гаспадарчымі суб’ектамі, павінны ўтрымліваць палажэнні, якія ўлічваюць абавязацельствы, прадугледжаныя Законам аб супрацьдзеянні здзяйсненню злачынстваў сексуальнага характару і аб абароне непаўналетніх (далей — «**Закон**»), а менавіта:
   - Гаспадарчы суб’ект заяўляе, што ён азнаёмлены са зместам Закона і вынікаючымі з яго абавязацельствамі, у тым ліку абавязацельствам зацвердзіць стандарты абароны непаўналетніх, вызначаныя ў артыкуле 22b Закона, а таксама з санкцыямі, звязанымі з іх невыкананнем;
   - Перад допускам да выканання прадугледжаных дагаворам задач у сферы адукацыі або рэалізацыі іншых інтарэсаў непаўналетніх, гаспадарчы суб’ект у кожным выпадку правярае асоб, якія ўдзельнічаюць у выкананні названых дзеянняў, на прадмет іх наяўнасці ў Рэестры асоб, якія здзейснілі злачынства сексуальнага характару і прадстаўляе Асацыяцыі інфармацыю аб выніках праверкі (раздрукоўку выпіскі).
8. Падрадчы:цамі Асацыяцыі не могуць быць асобы, якія:

   - унесеныя ў **Рэестр асоб, якія здзейснілі злачынства сексуальнага характару** або ў дачыненні да якіх вынесены **канчатковы прыгавор за злачынства**, прадугледжанае раздзеламі XIX і XXV, а таксама артыкуламі 189a і 207 Крымінальнага кодэкса ад 6 чэрвеня 1997 года, Законам аб супрацьдзеянні наркаманіі ад 29 ліпеня 2005 года, або за адпаведныя забароненыя дзеянні, прадугледжаныя заканадаўствам іншых краін;
   - не прайшлі праверку на наяўнасць у Рэестры асоб, якія здзейснілі злачынства сексуальнага характару, і не прадставілі даведку з Нацыянальнага рэестра злачынцаў, названую ў пп. 2 і 3 вышэй;
   - не прадставілі звестак або заявы ў адпаведнасці з пп. 3-7 ст. 21 Закона аб супрацьдзеянні здзяйсненню злачынстваў сексуальнага характару і аб абароне непаўналетніх ад 13 мая 2016 года, або ў дачыненні да якіх былі атрыманыя звесткі аб вядзенні ў дачыненні да іх крымінальных вытворчасці, названай у арт. 2 ці п. 3 арт. 21 вышэйзгаданага Закона.

# §3
# Абавязкі персаналу

1. У прысутнасці дзяцей персаналу забараняецца выкарыстоўваць выказванні, якія ўтрымліваюць дыскрымінацыю, абразу або прыніжэнне асоб або груп па прыкмеце іх рэлігійных, палітычных перакананняў, светапогляду, нацыянальнасці, фізічных

магчымасцей, узросту, полу, сексуальнай арыентацыі, а таксама іншыя выказванні, якія садзейнічаюць фармаванню варожасці да сацыяльных груп або асоб.

2. У прысутнасці дзяцей персанал абавязаны ўстрымліваццa ад выказванняў і дзеянняў, якія могуць негатыўна ўплываць на іх развіццё. Забараняецца прапаведаваць погляды, што ўсхваляюць паводзіны, якія з'яўляюцца супрацьзаконнымі, шкоднымі для псіхічнага здароўя, непрымальнымі для непаўналетніх або неадпаведнымі ўзросту дзіцяці.
3. У прысутнасці дзіцяці персаналу забараняецца каментаваць яго сямейную сітуацыю, ставіць пад сумнеў кампетэнтнасць і рашэнні апяку:нак дзіцяці ці іншым чынам закранаць магчымыя праблемы і цяжкасці ў сям'і дзіцяці.
4. Супрацоўні:цы/падрадчы:цы, якія ўзаемадзейнічаюць з дзецьмі, могуць у любы час падвяргацца праверкам на наяўнасць у іх арганізме алкаголю і/ці іншых рэчываў аналагічнага дзеяння. Такія праверкі могуць праводзіцца выбарачна і не вымагаюць наяўнасці прыкмет падазроных паводзін.
5. Асоба, чый аналіз на наяўнасць алкаголю або аналагічных рэчываў выявіўся станоўчым, неадкладна і на нявызначаны тэрмін адхіляецца ад любых кантактаў з дзецьмі, а Асацыяцыя пакідае за сабой права скасаваць з ёй адпаведны дагавор.
6. Супрацоўні:ца/падрадчы:ца абавязуецца паведаміць Асацыяцыі аб узбуджэнні ў дачыненні да я:е крымінальнай вытворчасці, звязанай са злачынствамі, названымі ў даведцы аб адсутнасці судзімасці з Нацыянальнага рэестра злачынцаў, прадстаўленай на этапе найму, незалежна ад стадыі вытворчасці па справе.
7. Асоба, у дачыненні да якой вядзецца крымінальны працэс за злачынствы супраць дзяцей, неадкладна адхіляецца ад любога кантакту з дзецьмі да вынясення канчатковага рашэння на карысць такой асобы.

## §4
## Адносіны персаналу з дзецьмі

1. Заняткі з удзелам дзяцей павінны ўлічваць узровень развіцця дзіцяці і яго індывідуальныя здольнасці. Форма правядзення заняткаў не павінна выключаць дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі і асаблівымі патрэбамі, якія маюць права ўдзельнічаць ва ўсіх мерапрыемствах на роўных умовах.
2. Мерапрыемствы, якія арганізуюцца для дзяцей, не могуць фармаваць або рэтрансляваць шкодныя стэрэатыпы, якія датычацца палавой прыналежнасці, сексуальнай арыентацыі, нацыянальнага або этнічнага паходжання, веравызнання, стану здароўя або сямейнага становішча.
3. Да кожнага дзіцяці персаналу належыць ставіцца з павагай і камунікаваць з ім зразумелай для яго мовай. **Паводзіны і выказванні, якія можна трактаваць як кпіны або могуць абразіць, прынізіць або напалохаць дзіця, недапушчальныя.**
4. Усе дзеці заслугоўваюць справядлівага стаўлення, любая форма фаварытызму або дыскрымінацыі ў адносінах да дзяцей недапушчальная. Персаналу належыць тлумачыць дзецям свае рашэнні і дзеянні ў зразумелай для іх і адпаведнай іх узросту

форме. **У прысутнасці дзяцей не дапускаюцца вульгарныя паводзіны, каментарыі аб фізічнай прывабнасці або сексуальнай актыўнасці, кампліменты або крытыка знешнасці.**

## §5
## Фізічны кантакт

1. Асабісты кантакт з дзіцем належыць абмежаваць сітуацыямі, у якіх ён неабходны і натуральны, напрыклад, дапамога дзіцяці пры выкананні фізічных практыкаванняў, неабходных гігіенічных працэдур, пры неабходнасці абараніць дзіця ў выпадках непасрэднай небяспекі або супакоіць яго.
2. Падчас арганізаваных паездак недапушчальна пражыванне ў адным пакоі з дзіцем дарослага, які не з'яўляецца яго апякун:кай.
3. Варта пазбягаць сітуацый, у якіх персанал застаецца сам-насам з дзіцем, а таксама любых паводзін, якія могуць быць няправільна зразумелымі самім дзіцем, яго апякун:камі, іншымі дзецьмі і дарослымі.
4. Усе кантакты паміж супрацоўні:цай/падрадчы:цай і дзіцем павінныя адбывацца на тэрыторыі Асацыяцыі, па магчымасці з адчыненымі дзвярыма або ў прысутнасці іншых людзей.
5. Супрацоўні:ца/падрадчы:ца павін:на быць асабліва чул:ай да дзіцяці, якое перажыло гвалт або неналежнае абыходжанне, а таксама да любога дзіцяці, чыя сямейная сітуацыя або траўматычны досвед могуць выклікаць павышаную патрэбу ў эмацыянальнай або цялеснай блізкасці.
6. Супрацоўні:ца/падрадчы:ца абавязан:ая ўсталяваць выразныя межы ў кантактах з дзіцем і яго сям'ёй, клапаціцца аб падтрыманні прафесійных адносін і, пры любых сумневах датычна гэтага, неадкладна кансультавацца са сва:ёй кіраўні:цай.
7. Забараняюцца цялесныя пакаранні дзяцей персаналам.

## §6
## Камунікацыя з дзіцем

1. Супрацоўні:ца/падрадчы:ца абавязан:ая ўсталяваць выразныя межы ў адносінах з дзіцем і паведаміць яму правілы, па якіх будуюцца гэтыя адносіны. У размовах з дзіцем супрацоўні:ца/падрадчы:ца не можа займаць бок у спрэчцы паміж дзіцем і апякун:кай/настаўні:цай, даваць псіхалагічныя, жыццёвыя і духоўныя парады, не валодаючы неабходнай для гэтага кваліфікацыяй і ў сітуацыях, калі гэта не з'яўляецца тэмай заняткаў з дзіцем.
2. Кантакты з дзецьмі павінныя адбывацца толькі ў працоўны час Асацыяцыі і быць звязанымі з бягучай дзейнасцю Асацыяцыі, у якой удзельнічае дзіця.
3. Камунікацыя з дзіцем арганізоўваецца празрыста як для яго апякун:ак, так і для кіраўніцтва Асацыяцыі. Супрацоўні:ца/падрадчы:ца не трымае ў сакрэце звестак, якія паведаміла ё:й дзіця і якія маюць важнае значэнне для яго здароўя і жыцці.

4. Кантакты паміж Асацыяцыяй і апякун:кай дзіцяці па пытаннях, датычных дзіцяці, ажыццяўляюцца па афіцыйных каналах. Супрацоўні:ца/падрадчы:ца не дзеліцца з дзіцем сваімі асабістымі кантактнымі данымі.
5. Супрацоўні:цы/падрадчы:цы не адпраўляюць дзецям і не прымаюць ад іх запрашэнні да ўзаемадзеяння ў асабістых уліковых запісах у сацыяльных сетках.
6. Калі камунікацыя з дзіцем адбываецца па электроннай пошце ці праз спецыяльныя групы ў мэсэнджарах, апякун:ка дзіцяці мае права доступу да гісторыі перапіскі, у тым ліку права ўступаць у такія групы або падпісвацца на рассылку.

## §7
## Адносіны паміж дзецьмі

1. Асацыяцыя надае асаблівую ўвагу бяспечным адносінам паміж дзецьмі, якія ўдзельнічаюць у арганізаваных ёй занятках і мерапрыемствах.
2. Дзеці, якія ўдзельнічаюць у мерапрыемствах Асацыяцыі, павінныя ставіцца з павагай да асобы і годнасці іншых дзяцей.
3. **У адносінах паміж дзецьмі не дапускаюцца паводзіны, якія можна аднесці да праявы неналежнага абыходжання з дзецьмі, напрыклад, вербальны або псіхалагічны гвалт.**
4. Асацыяцыя нясе адказнасць за забеспячэнне належных паводзін дзяцей у адносінах адно да аднаго, а таксама за іх адпаведную адукацыю ў гэтай галіне.

## §8
## Ахова персанальных даных

1. Персанальныя даныя дзіцяці абаронены ў адпаведнасці з Рэгламентам Еўрапейскага Парламента і Савета Еўрапейскага Саюза 2016/679 ад 27 красавіка 2016 г. аб ахове фізічных асоб пры апрацоўцы персанальных даных і аб свабодным абарачэнні такіх даных, а таксама аб адмене Дырэктывы 95/46/ЕС (Агульны рэгламент аб ахове персанальных даных).
2. У Асацыяцыі зацверджана палітыка аховы персанальных даных, якая гарантуе законную і бяспечную апрацоўку персанальных даных і была распрацаваная на аснове аналізу магчымых рызык, звязаных з апрацоўкай персанальных даных.
3. Персанальныя даныя дзяцей належыць апрацоўваць з захаваннем канфідэнцыяльнасці і забеспячэннем іх бяспекі.
4. **Для атрымання і апрацоўкі персанальных даных дзіцяці патрабуецца пісьмовая згода яго апякун:кі. Такая згода павінная быць канкрэтнай, інфармаванай, адназначнай і добраахвотнай.**
5. Згода не патрабуецца, калі апрацоўка персанальных даных ажыццяўляецца на іншых законных падставах. Асацыяцыя ў любым выпадку прымае на сябе абавязацельствы праінфармаваць аб гэтым апякун:ку дзіцяці.

6. Збіраць дазволена выключна тыя персанальныя даныя, якія абгрунтаваныя і звязаныя з дзейнасцю, што ажыццяўляецца з удзелам дзіцяці, а таксама яго патрэбамі і бяспекай.
7. Па магчымасці персанальныя даныя дзяцей, асабліва ўразлівыя, належыць ананімізаваць/псеўданімізаваць і знішчыць па дасягненні мэты, дзеля якой яны збіраліся.
8. Персанальныя даныя дзяцей належыць абараняць ад доступу любых асоб за выключэннем персаналу, які непасрэдна ўдзельнічае ў дзейнасці, якая патрабуе апрацоўкі такіх даных. Раскрыццё гэтых даных іншым членам персаналу, іншым дзецям і іх апякун:кам, а таксама прадстаўнікам сродкаў масавай інфармацыі не дапускаецца.
9. **Перадача інфармацыі аб дзецях і іх сем'ях па тэлефоне або электроннай пошце дапускаецца толькі пасля папярэдняга атрымання пісьмовага пацвярджэння ад апякун:кі дзіцяці, якое сведчыць асобу чалавека, які звяртаецца з такім запытам, і яго права на атрыманне гэтых звестак.**
10. Абмежаванні на перадачу трэцім асобам персанальных даных і іншай інфармацыі аб дзецях не прымяняюцца ў адносінах да асоб і ўстаноў, упаўнаважаных законам запытваць доступ да такіх даных, а таксама ў выпадках, калі арганізацыя звяртаецца ў названыя ўстановы для прыняцця неабходных мер.

# §9
# Ахова выявы

1. Асацыяцыя паважае права дзіцяці на прыватнае жыццё, ахову яго выявы і асабістых нематэрыяльных даброт, якое рэгулюецца прынятымі правіламі стварэння і публікацыі выяў дзяцей падчас заняткаў, арганізаваных Асацыяцыяй.
2. Па магчымасці варта пазбягаць стварэння і публікацыі выяў дзяцей, якія карыстаюцца паслугамі Асацыяцыі, калі ў гэтым няма неабходнасці і існуюць іншыя спосабы дасягнення мэты, для якой плануецца выкарыстанне такіх выяў.
3. У ілюстрацыйных мэтах, у тым ліку для рэкламных матэрыялаў або матэрыялаў, скіраваных на збор сродкаў, рэкамендуецца выкарыстоўваць фатаграфіі, на якіх немагчыма ідэнтыфікаваць дзіця або ўзятыя з агульнадаступных крыніц.
4. **Для стварэння выявы дзіцяці патрабуецца пісьмовая згода апякун:кі. Яна павінная быць канкрэтнай, інфармаванай, адназначнай і добраахвотнай, а асобу, якая дае згоду, належыць падрабязна праінфармаваць аб мэтах стварэння выявы дзіцяці і магчымых спосабах яе выкарыстання, уключаючы размяшчэнне ў інтэрнэце.**
5. Згода на стварэнне і/або выкарыстанне выявы дзіцяці не можа быць меркаванай або змушанай. Перад атрыманнем любой згоды ад апякун:кі дзіцяці належыць паведаміць ё:й, што наяўнасць згоды не з'яўляецца ўмовай удзелу дзіцяці ў прапанаваных мерапрыемствах.
6. Па магчымасці, дазвол на стварэнне/публікацыю выявы варта запытваць у самога дзіцяці, і ў выпадку адмовы неабходна паважаць яго рашэнне.

7. Адмова даць згоду на стварэнне і публікацыю выявы дзіцяці не можа быць прычынай для выключэння дзіцяці з заняткаў або прымянення іншых дыскрымінацыйных мер.
8. Персанал не стварае выявы дзяцей для асабістага карыстання і не публікуе ў сваіх сацыяльных сетках выявы дзяцей, створаныя ў рамках дзейнасці Асацыяцыі.
9. У выпадку правядзення мерапрыемстваў з удзелам староннiх людзей і неабходнасці забяспечыць кантроль над стварэннем і выкарыстаннем выяў дзяцей, якія ўдзельнічаюць у мерапрыемстве, Асацыяцыя можа абмежаваць удзельні:цам магчымасць фатаграфавання і забяспечыць стварэнне выяў сваімі сіламі або даручыць гэтую задачу адпаведным спецыялістам.
10. Усе асобы, якія трапілі на фатаграфіі або відэа, павінныя быць цалкам апранутыя і не могуць быць паказаныя ў зневажальнай, насмешлівай ці іншай форме, якая парушае іх асабістыя правы.
11. На фатаграфіях і відэа належыць адлюстроўваць групу, а не асобных дзяцей, і па магчымасці падчас выканання імі агульных заданняў.
12. Пры публікацыі выяў дзяцей неабходна пераканацца, што кампазіцыя фота- або відэаматэрыялу не стварае рызыкі змянення выявы такім чынам, які можа парушыць асабістыя правы дзіцяці.
13. Публічна размешчаная выява дзіцяці, якое карыстаецца паслугамі Асацыяцыі, не павінна змяшчаць інфармацыі, якая магла б дапамагчы староннім асобам ідэнтыфікаваць дзіця або стварыць пагрозу яго бяспецы.

# § 10
# Карыстанне электроннымі прыладамі і інтэрнэтам

1. Апякун:кі пакідаюць за сабой права вызначаць, да якога кантэнту маюць доступ іх дзеці, у тым ліку падчас знаходжання дзіцяці на тэрыторыі Асацыяцыі. Выдача дзецям камп’ютараў, смартфонаў і іншых прылад, якія забяспечваюць доступ да анлайн-кантэнту, а таксама мабільных тэлефонаў падчас знаходжання на тэрыторыі Асацыяцыі ажыццяўляецца з дазволу апякун:кі дзіцяці.
2. Персанал абавязаны сачыць за тым, як дзеці выкарыстоўваюць камп’ютары і мабільныя тэлефоны, што выдаюцца ў карыстанне Асацыяцыяй, асабліва калі яны падлучаныя да інтэрнэту.
3. На камп’ютарах, смартфонах і аналагічных прыладах, даступных для карыстання дзяцей на тэрыторыі Асацыяцыі, належыць наладзіць сродкі абароны, якія гарантуюць бяспеку перадаваных даных і прадухіляюць выкарыстанне сайтаў з небяспечным або непрыстойным зместам (бацькоўскі кантроль).
4. Асацыяцыя пакідае за сабой права забараніць выкарыстанне дзецьмі відэа- і аўдыёзапісвальных прылад падчас асобных заняткаў, калі гэта абумоўлена меркаваннямі бяспекі дзяцей і/або неабходнасцю забяспечыць іх прыватнасць шляхам забароны некантраляванага вядзення запісу.

# § 11
# Прынцыпы дзеянняў і працэдуры ў выпадках неналежнага абыходжання з дзецьмі

Алгарытм дзеянняў у выпадку ўзнікнення падазрэння або атрымання паведамлення аб неналежным абыходжанні з дзецьмі:

1. У выпадку ўзнікнення падазрэння аб неналежным абыходжанні з дзіцем першачарговай задачай з'яўляецца аказанне яму ўсялякай дапамогі і падтрымкі неадкладна пасля атрымання адпаведнай інфармацыі.
2. Незалежна ад іншых мер, накіраваных на высвятленне абставін справы і наданне ёй афіцыйнага статусу, **праўленне Асацыяцыі** неадкладна вызначае формы падтрымкі дзіцяці, якое стала ахвярай гвалту, а таксама, калі гэта актуальна, іншых дзяцей, якія былі яго сведкамі ці маглі пацярпець іншым чынам. Пад формай падтрымкі разумеецца перадача справы арганізацыям, якія займаюцца прафесійнай дапамогай у такіх сітуацыях, сацыяльным установам, паліцыі ці пракуратуры. Асацыяцыя выбірае адпаведныя формы падтрымкі ў залежнасці ад канкрэтнага інцыдэнту.
3. Супрацоўні:ца/падрадчы:ца, якая атрымала інфармацыю аб неналежным абыходжанні непасрэдна ад дзіцяці, ні ў якім выпадку не ставіць пад сумнеў праўдзівасць апісаных дзіцем падзей, незалежна ад уласнай ацэнкі пачутага.
4. Супрацоўні:ца/падрадчы:ца не мае права самастойна расследаваць паведамленні або заснаваныя на назіранні ўласныя здагадкі аб неналежным абыходжанні з дзіцем без папярэдняга апавяшчэння **праўлення Асацыяцыі** і атрымання на гэта яго яўнай згоды.
5. Асацыяцыя не ўлічвае меркаванні апякун:кі дзіцяці ў выпадку падазрэння аб здзяйсненні злачынства супраць дзіцяці, незалежна ад асобы злачынцы.

# § 12
# Умяшанне ў выпадку выяўлення розных форм неналежнага абыходжання з дзецьмі

1. Кожны выпадак устанаўлення факта або падазрэння ў неналежным абыходжанні з дзіцем належыць зарэгістраваць у **Пратаколе ўмяшання** і апавясціць аб гэтым **праўленне Асацыяцыі** або **асобу, упаўнаважаную праўленнем**, для каардынацыі дзеянняў, звязаных з бяспекай дзяцей, якія знаходзяцца пад апекай Асацыяцыі, гэта значыць адказнай за прыём паведамленняў аб здарэннях, якія пагражаюць дзіцяці, і аказанне яму падтрымкі. **Такой упаўнаважанай асобай з'яўляецца Наталля Калужа.** Паведамленні можна дасылаць па электроннай пошце ochronadziecka@krytykapolityczna.pl. Форма Пратакола ўмяшання прыводзіцца ў **Дадатку 1** да Стандартаў. Пратакол умяшання і ўся звязаная з інцыдэнтам

дакументацыя далучаецца да асабістай справы дзіцяці і захоўваецца ў адпаведнасці з прынцыпамі, апісанымі ў §17 Стандартаў.

2. На аснове пераказанай інфармацыі і атрыманых тлумачэнняў **праўленне Асацыяцыі** вызначае спосаб правядзення ўмяшання і адказную за яго асобу. Правядзенне самастойнага расследавання супрацоўні:цай/падрадчы:цай Асацыяцыі без ведама і згоды праўлення Асацыяцыі не дапускаецца.
3. Праўленне неадкладна інфармуе апякун:ак дзіцяці аб здарэнні і запланаваным умяшанні і, пры неабходнасці, садзейнічае іх звароту за дапамогай да спецыялістаў.
4. Асацыяцыя не ўлічвае меркаванні апекун:ак дзіцяці пры выбары прыдатнай формы ўмяшання, калі дзіця падвергнулася неналежнаму абыходжанню або хатняму гвалту.
5. У выпадку падазрэння, што здароўю або жыццю дзіцяці можа пагражаць непасрэдная небяспека, належыць неадкладна паведаміць аб гэтым адпаведным службам (паліцыі, хуткай дапамозе) па экстранным нумары 112 або 999 (хуткая дапамога). Такое апавяшчэнне ажыццяўляе супрацоўні:ца/ падрадчы:ца, якая перша:й даведалася пра такую пагрозу, пасля чаго запаўняецца Пратакол умяшання.

# § 13
# Неналежнае абыходжанне з дзіцем з боку дарослага

1. У выпадку падазрэння ў здзяйсненні злачынства супраць дзіцяці дарослай асобай **праўленне Асацыяцыі** паведамляе аб гэтым паліцыі або пракуратуры.
2. Абавязак апавяшчэння адпаведных служб тычыцца таксама падазрэння ў здзяйсненні злачынства ў форме хатняга гвалту ў сям'і дзіцяці, калі дзіця з'яўляецца яго ахвярай або сведкам.
3. У выпадку падазрэння ў неналежным абыходжанні з дзіцем з боку супрацоўні:цы/падрадчы:цы Асацыяцыі, я:е неабходна неадкладна адхіліць ад любых форм кантакту з дзецьмі (не толькі з пацярпелым дзіцем) да высвятлення абставін.
4. Узор апавяшчэння аб падазрэнні ў здзяйсненні злачынства прыводзіцца ў **Дадатку 6** да Стандартаў.

# § 14
# Неналежнае абыходжанне з дзіцем з боку іншага дзіцяці

1. У выпадку падазрэння ў неналежным абыходжанні з дзіцем з боку іншага дзіцяці, неабходна правесці гутарку з падазраваным дзіцем і яго апякун:камі, а таксама асобную гутарку з пацярпелым дзіцем і яго апякун:камі. Мэта гутаркі складаецца ў высвятленні ходу падзей, а таксама ўплыву, які аказала здарэнне на псіхічнае і фізічнае здароўе пацярпелага дзіцяці. Выяўленыя факты належыць зафіксаваць у Пратаколе ўмяшання, складзеным для кожнага дзіцяці асобна.

2. Калі падазраваным у неналежным абыходжанні з’яўляецца дзіця ва ўзросце ад 13 да 17 гадоў, і яго паводзіны ўяўляюць сабой злачынства, неабходна паінфармаваць адпаведны сямейны суд або паліцыю па месцы інцыдэнту.
3. Калі падазраваным у неналежным абыходжанні з’яўляецца дзіця старэйшае за 17 гадоў, а яго паводзіны ўяўляюць сабой злачынства, неабходна паінфармаваць адпаведны орган паліцыі або пракуратуру па месцы інцыдэнту.

# § 15
# Занядбанне дзіцяці ў сямейным асяроддзі

1. У выпадку падазрэння ў занядбанні патрэб дзіцяці ў сямейным асяроддзі **праўленне Асацыяцыі** падае ў раённы суд па месцы жыхарства (аддзел сям’і і непаўналетніх) пісьмовае хадайніцтва аб правядзенні разгляду сітуацыі дзіцяці/сям’і. Узор такога хадайніцтва прыводзіцца ў **Дадатку 7** да Стандартаў.
2. У выпадку падазрэння, што апякун:ка дзіцяці занядбоўвае яго псіхафізічныя патрэбы або сям’я не здольная забяспечыць належнае выхаванне (напрыклад, дзіця носіць адзенне, якое не адпавядае надвор’ю, пакідае месца пражывання без нагляду дарослага), або калі ў сям’і ўжываецца гвалт у дачыненні да дзіцяці (апякун:ка або іншы член сям’і павышае голас на дзіця, шлёпае яго або прымяняе падобныя фізічныя пакаранні), неабходна неадкладна паінфармаваць адпаведны цэнтр сацыяльнай дапамогі для правядзення аналізу сітуацыі ў сям’і і вызначэння неабходных форм падтрымкі.

# §16
# Абавязак захавання канфідэнцыяльнасці

Усе супрацоўні:цы/падрадчы:цы, якія валодаюць інфармацыяй аб неналежным абыходжанні з дзецьмі ў сувязі з выкананнем сваіх абавязкаў, абавязаны захоўваць канфідэнцыяльнасць адносна ўсіх звязаных з гэтым абставін. Выключэннем з’яўляецца паведамленне інфармацыі ўпаўнаважаным дзяржаўным установам у рамках ажыццяўлення ўмяшання і апякун:кам дзіцяці ў рамках рэалізацыі імі бацькоўскіх правоў.

# §17
# Прынцыпы вядзення і захоўвання дакументацыі

1. Усе сабраныя ў сувязі з правядзеннем мерапрыемстваў з удзелам дзяцей даныя захоўваюцца ў Асацыяцыі на працягу прынамсі 2 гадоў з даты прыёму паведамлення або да завяршэння ўсёй звязанай з імі вытворчасці, калі тэрмін вытворчасці перавышае 2 гады.

2. Па магчымасці асабістыя даныя дзяцей належыць захоўваць у ананімізаванай/псеўданімізаванай форме.

# § 18
# Забеспячэнне доступу да тэксту Стандартаў

1. Поўны тэкст Стандартаў даступны на сайце Асацыяцыі https://krytykapolityczna.pl/ у раздзеле «Стандарты абароны дзяцей ад неналежнага абыходжання».
2. Скарочаная версія Стандартаў у зразумелай для дзяцей форме размяшчаецца на бачным месцы ў офісе Асацыяцыі.

# § 19
# Перагляд і абнаўленне Стандартаў

1. Гэты тэкст Стандартаў падлягае рэгулярнаму перагляду, не радзей за раз на два гады.
2. Персанал і апякункі дзяцей, якія наведваюць арганізаваныя Асацыяцыяй заняткі, могуць уносіць свае заўвагі і прапановы па змяненні дадзенага дакумента на бягучай аснове.
3. **Праўленне Асацыяцыі прызначае Наталлю Калужу адказнай за Стандарты абароны дзяцей ад неналежнага абыходжання ў Асацыяцыі імя Станіслава Бжазоўскага.**
4. Асоба, названая ў папярэднім пункце, адказвае за рэагаванне на любое паведамленне аб парушэнні Стандартаў, унясенне прапаноў па іх змяненні, а таксама правядзенне ацэначнага апытання сярод персаналу Асацыяцыі раз на два гады. Узор апытальнага ліста прыводзіцца ў **Дадатку 10** да Стандартаў.
5. **Праўленне Асацыяцыі** ўносіць неабходныя змяненні ў Стандарты і аб'яўляе аб новай рэдакцыі Стандартаў.

# § 20
# Забеспячэнне выканання палажэнняў Стандартаў персаналам

1. За забеспячэнне выканання палажэнняў Стандартаў персаналам адказвае **асоба, адказная за Стандарты абароны дзяцей ад неналежнага абыходжання ў Асацыяцыі імя Станіслава Бжазоўскага,** названая ў **§ 19 п. 3 Стандартаў,** у наступным аб'ёме:

   a) азнаямленне супрацоўні:ц і падрадчы:ц з дзеючымі Стандартамі;
   b) прадстаўленне супрацоўні:цам і падрадчы:цам усёй неабходнай інфармацыі, звязанай з палажэннямі Стандартаў і іх выкананнем.

2. Супрацоўні:цы і падрадчы:цы павінныя азнаёміцца са Стандартамі Асацыяцыі і прымяняць іх на практыцы, а таксама ўдзельнічаць у трэнінгах, звязаных з іх прымяненнем.
3. Супрацоўні:цы і падрадчы:цы пацвярджаюць азнаямленне і прыняцце Стандартаў праз падпісанне заявы, якая далучаецца да іх асабістай справы. Узор заявы прыводзіцца ў **Дадатку 2** да Стандартаў.

*IV. Дадаткі*

# Дадатак 1

## Пратакол умяшання

1. Імя непаўналетня:й:......................................................................................................................
2. Прычына ўмяшання (форма неналежнага абыходжання):
   ..................................................................................................................
   ..................................................................................................................
3. Асоба, якая паведаміла аб падазрэнні ў неналежным абыходжанні:......................................................................................................................
4. Захады, распачатыя ў дачыненні да непаўналетня:й:
   ..................................................................................................................
   ..................................................................................................................
5. Прыняты план аказання дапамогі (пры наяўнасці):
   ..................................................................................................................
6. Сустрэчы з апякун:кай непаўналетня:й:
   ..................................................................................................................
   ..................................................................................................................
7. Юрыдычнае ўмяшанне (патрэбнае падкрэсліць)

- апавяшчэнне аб падазрэнні ў здзяйсненні злачынства,
- хадайніцтва аб правядзенні разгляду сітуацыі дзіцяці/сям'і,
- іншыя меры (апішыце ніжэй).

   ..................................................................................................................
   ..................................................................................................................

8. Звесткі аб прынятых мерах умяшання (назва і адрас органа, у які быў пададзены зварот):
   ..................................................................................................................
   ..................................................................................................................
9. Вынікі ўмяшання:
   ..................................................................................................................
   ..................................................................................................................
10. Меры, прынятыя ў адносінах да асобы, якая дапусціла неналежнае абыходжанне з дзіцем:
    ..................................................................................................................

дата і подпіс асобы, якая аформіла пратакол

# Дадатак 2

## Асабістыя даныя суіскальні:цы

У сувязі з планаваным прызначэннем на працу з дзецьмі мы абавязаны праверыць Вас у Рэестры асоб, якія здзейснілі злачынства сексуальнага характару.

Гэта абавязак вынікае з арт. 21 п. 2 Закона аб супрацьдзеянні здзяйсненню злачынстваў сексуальнага характару і аб абароне непаўналетніх ад 13 мая 2016 года (Заканадаўчы веснік за 2024 г., паз. 560).
Просім падаць даныя, неабходныя для правядзення праверкі:
Імя:
..................................................................................................................................
Прозвішча:
..................................................................................................................................
Дзявоцкае прозвішча:
..................................................................................................................................
PESEL:
..................................................................................................................................
Імя бацькі:
..................................................................................................................................
Імя маці:
..................................................................................................................................

Інфармуем Вас, што

- персанальныя даныя, якія ўтрымліваюцца ў гэтай заяве, апрацоўваюцца на падставе юрыдычнага абавязку (арт. 6 п. 1с Агульнага рэгламента аб абароне персанальных даных), ускладзенага на адміністратара персанальных даных у адпаведнасці з Законам аб супрацьдзеянні здзяйсненню злачынстваў сексуальнага характару і аб абароне непаўналетніх, а мэтай апрацоўкі даных з'яўляецца праверка адпаведнасці заканадаўчым крытэрыям допуску да працы з дзецьмі.
- Вам належыць права доступу да Вашых даных, іх выпраўлення, выдалення, абмежавання апрацоўкі, а таксама права падаць скаргу Прэзідэнту Упраўлення па абароне персанальных даных (адрас: вул. Стаўкі 2, 00-193 Варшава), калі Вы палічыце, што апрацоўка даных ажыццяўляецца незаконна;
- Вашы даныя не будуць падвяргацца прафіляванню і не будуць перадавацца ў трэція краіны;
- прадстаўленне даных з'яўляецца добраахвотным, аднак адмаўленне ад іх прадстаўлення азначае немагчымасць ажыццяўлення дзейнасці, якая прадугледжвае кантакт з дзецьмі.

Імя, прозвішча...................................................................
Дата.......................................................................................
Подпіс...........................................................................

# Дадатак 3

# Дэкларацыя аб краінах пражывання

1. Выконваючы абавязацельства, прадугледжанае п. 5 і 6 арт. 21 Закона аб супрацьдзеянні здзяйсненню злачынстваў сексуальнага характару і аб абароне непаўналетніх ад 13 мая 2016 года (Заканадаўчы веснік за 2024 г., паз. 560), заяўляю, што на працягу апошніх 20 гадоў я пражыва:ла ў наступных краінах, акрамя Польшчы:

| | Краіна пражывання | Перыяд пражывання |
|---|---|---|
| 1 | | |
| 2 | | |
| 3 | | |

2. Прыкладаю звесткі з крымінальных рэестраў гэтых краін, атрыманыя для мэт прафесійнай або валанцёрскай дзейнасці, якая прадугледжвае кантакт з дзецьмі.
3. Мне вядома аб крымінальнай адказнасці за прадстаўленне ілжывых звестак.
4. Я паінфармаван:ая аб тым, што:
   - мае персанальныя даныя, якія ўтрымліваюцца ў гэтай заяве, апрацоўваюцца на падставе юрыдычнага абавязку (арт. 6 п. 1c Агульнага рэгламента аб абароне персанальных даных), ускладзенага на адміністратара персанальных даных у адпаведнасці з Законам аб супрацьдзеянні здзяйсненню злачынстваў сексуальнага характару і аб абароне непаўналетніх, а мэтай апрацоўкі даных з’яўляецца праверка адпаведнасці заканадаўчым крытэрыям допуску да працы з дзецьмі;
   - мне належыць права доступу да маіх даных, іх выпраўлення, выдалення, абмежавання апрацоўкі, а таксама права падаць скаргу Прэзідэнту Упраўлення па абароне персанальных даных (адрас: вул. Стаўкі 2, 00-193 Варшава), калі я палічу, што апрацоўка даных ажыццяўляецца незаконна;
   - мае даныя не будуць падвяргацца прафіляванню і не будуць перадавацца ў трэція краіны;
   - прадстаўленне даных з’яўляецца добраахвотным, аднак адмаўленне ад іх прадстаўлення азначае немагчымасць ажыццяўлення дзейнасці, якая прадугледжвае кантакт з дзецьмі.

Імя, прозвішча....................................................................
Дата...........................................................................
Подпіс..........................................................................

# Дадатак 4

# Дэкларацыя аб адсутнасці судзімасці

Выконваючы абавязацельства, прадугледжанае п. 7 арт. 21 Закона аб супрацьдзеянні здзяйсненню злачынстваў сексуальнага характару і аб абароне непаўналетніх ад 13 мая 2016 года (Заканадаўчы веснік за 2024 г., паз. 560), усведамляючы крымінальную адказнасць за прадстаўленне ілжывых звестак, заяўляю, што:

1. Заканадаўства дзяржавы ……..…………………., у якой я пражыва:ла ў перыяд …..........…............…, не прадугледжвае* выдачы даведак для мэт ажыццяўлення прафесійнай або валанцёрскай дзейнасці, звязанай з кантактам з дзецьмі, прадугледжаных арт. 21 Закона аб супрацьдзеянні здзяйсненню злачынстваў сексуальнага характару і абароне непаўналетніх ад 13 мая 2016 года.
2. У дачыненні да мяне ў згаданай дзяржаве не выносіўся канчатковы прысуд за дзеянні, якія з’яўляюцца злачынствамі, прадугледжанымі раздзеламі XIX і XXV Крымінальнага кодэкса, арт. 189А і арт. 207 Крымінальнага кодэкса, а таксама Законам аб супрацьдзеянні наркаманіі.
3. У дачыненні да мяне не выносілася іншае рашэнне, якое ўстанаўлівае, што я здзяйсня:ла вышэйзгаданыя забароненыя дзеянні.
4. На мяне не накладзена забарона, якая вынікае з рашэння суда, іншага ўпаўнаважанага органа або закона, на займанне любых або пэўных пасад, ажыццяўленне любой або пэўнай прафесійнай і іншай дзейнасці, звязанай з выхаваннем, адукацыяй, адпачынкам, лячэннем, аказаннем псіхалагічных кансультацый, духоўным развіццём, заняткамі спортам або рэалізацыяй іншых інтарэсаў непаўналетніх, або з апекай над імі.

Я паінфармаван:ая аб тым, што:

- мае персанальныя даныя, якія ўтрымліваюцца ў гэтай заяве, апрацоўваюцца на падставе юрыдычнага абавязку (арт. 6 п. 1c Агульнага рэгламента аб абароне персанальных даных), ускладзенага на адміністратара персанальных даных у адпаведнасці з Законам аб супрацьдзеянні здзяйсненню злачынстваў сексуальнага характару і аб абароне непаўналетніх, а мэтай апрацоўкі даных з’яўляецца праверка адпаведнасці заканадаўчым крытэрыям допуску да працы з дзецьмі;
- мне належыць права доступу да маіх даных, іх выпраўлення, выдалення, абмежавання апрацоўкі, а таксама права падаць скаргу Прэзідэнту Упраўлення па абароне персанальных даных (адрас: вул. Стаўкі 2, 00-193 Варшава), калі я палічу, што апрацоўка даных ажыццяўляецца незаконна;
- мае даныя не будуць падвяргацца прафіляванню і не будуць перадавацца ў трэція краіны;
- прадстаўленне даных з’яўляецца добраахвотным, аднак адмаўленне ад іх прадстаўлення азначае немагчымасць ажыццяўлення дзейнасці, якая прадугледжвае кантакт з дзецьмі.

Імя, прозвішча..................................................................

Дата.........................................................................

Подпіс......................................................................

**Заўвага. Закон не рэгулюе правілы падачы дэкларацыі ў выпадку знаходжання ў дзяржаве, у якой прадугледжана выдача даведак аб адсутнасці судзімасці, але атрыманне такой даведкі асобай, якая падае дэкларацыю, па аб'ектыўных прычынах немагчыма. У такім выпадку асоба, якая падае дэкларацыю, можа змяніць гэты пункт, падрабязна апісаўшы канкрэтную сітуацыю і прычыны, па якіх яна не можа атрымаць такую даведку. Пры гэтым такая працэдура законам не прадугледжана, і арганізацыя, якая прымае дэкларацыю, можа прызнаць тлумачэнні недастатковымі для допуску асобы да працы з дзецьмі.*

# Дадатак 5

## Інструкцыі для суіскальні:цы

Згодна з Законам аб супрацьдзеянні здзяйсненню злачынстваў сексуальнага характару і абароне непаўналетніх, мы абавязаны праводзіць дбайную праверку ўсіх асоб, якіх мяркуецца дапусціць да кантактаў з непаўналетнімі. Адным з элементаў такой праверкі з'яўляецца ўстанаўленне факта наяўнасці або адсутнасці судзімасці за злачынствы, прадугледжаныя гэтым законам. Прадстаўленне адпаведнай даведкі з'яўляецца абавязковай умовай для пачатку працы ці іншай дзейнасці, звязанай з кантактам з дзецьмі.

Ніжэй прыведзена кароткая інструкцыя атрымання неабходнай выпіскі ў электронным выглядзе з дапамогай сістэмы e-KRS. Вам спатрэбіцца давераны профіль ePUAP (profil zaufany) або электронны подпіс. Плата за падачу заявы складае 20 злотых.

1. Зайдзіце на сайт Нацыянальнага рэестра злачынцаў (https://ekrk.ms.gov.pl/ep-web).
2. Зарэгіструйцеся і актывуйце свой уліковы запіс, выбраўшы фармуляр для фізічнай асобы.
3. У левым верхнім куце націсніце на ўкладку «Заявы і запыты» („Wnioski i zapytania") і абярыце «Заява аб праверцы асобы» („Wniosek o osobę").
4. У пункце 11 адзначце «картатэка судзімасцей» і «картатэка непаўналетніх».
5. У пункце 12 укажыце «Артыкул 21 п. 3 Закона аб супрацьдзеянні здзяйснення злачынстваў сексуальнага характару і абароне непаўналетніх ад 13 мая 2016 года (Заканадаўчы веснік за 2024 г., паз. 560)».
6. Захавайце і падпішыце заяву давераным профілем ePUAP (profil zaufany) або электронным подпісам.
7. Аплаціце апрацоўку заявы.

Калі выпіска будзе гатова, вы атрымаеце паведамленне на сваю электронную скрыню для зваротаў ePUAP. Стандартны тэрмін чакання складае 7 дзён, аднак у перыяд свят, калі колькасць запытаў павялічваецца, ён можа быць падоўжаны да 14 дзён.

Вы таксама можаце атрымаць даведку ў папяровым выглядзе непасрэдна ў інфармацыйных пунктах Нацыянальнага рэестра злачынцаў. Плата ў гэтым выпадку складзе 30 злотых, але час чакання будзе менш.

Даведку належыць прадставіць асобе, якая праводзіць набор персаналу ад імя Асацыяцыі.

Прававая аснова: Артыкул 21 п. 3 Закона аб супрацьдзеянні здзяйсненню злачынстваў сексуальнага характару і аб абароне непаўналетніх ад 13 мая 2016 года (Заканадаўчы веснік за 2024 г., паз. 560)

# Дадатак 6

## Апавяшчэнне аб падазрэнні ў здзяйсненні злачынства (узор)

Горад, дата………..................................
Раённая пракуратура ў......................................... [1]
Арганізацыя, якая падае апавяшчэнне:..........................................…
зарэгістраваная па адрасе..........................................…
Прадстаўні:ца:............................................
адрас для карэспандэнцыі:..........................................…

**Апавяшчэнне аб падазрэнні ў здзяйсненні злачынства**

Сапраўдным апавяшчаю аб падазрэнні ў здзяйсненні злачынства …………………… …………………………… у дачыненні да непаўналетня:й …………………………… (імя і прозвішча, дата нараджэння) з боку …………………………… (імя і прозвішча меркавана:й правапарушальні:цы).

**Абгрунтаванне**

У ходзе выканання службовых абавязкаў …………………………… (імя і прозвішча супрацоўні:цы/валанцёр:кі) непаўналетн:яя …………………………… (імя і прозвішча дзіцяці) паведамі:ла звесткі, датычныя я:е ўзаемаадносін з …………………, якія выклікалі занепакоенасць[2].

Дадатковае апісанне меркаванага злачынства

........................................................................................................................................
........................................................................................................................................
........................................................................................................................................
........................................................................................................................................

Улічваючы вышэйзгаданае, а таксама з мэтай забеспячэння найлепшых інтарэсаў і бяспекі непаўналетня:й, прашу распачаць вытворчасць па дадзенай справе.

Асоба, да якой можна звярнуцца па дадатковую інфармацыю: …………………………… (імя і прозвішча, тэлефон, паштовы адрас).

Прашу накіроўваць усю карэспандэнцыю па ўказаным паштовым адрасе з пазначэннем рэгістрацыйнага нумара гэтай заявы.

.............................................................
подпіс упаўнаважанай асобы

*[1] Апавяшчэнне належыць падаць у раённую пракуратуру або адпаведны аддзел паліцыі па месцы здзяйснення злачынства.*

*[2] Апісанне сітуацыі, якая адбылася. Належыць падрабязна апісаць акалічнасці здарэння, уключаючы дату, месца, магчымых сведак, а таксама асобу меркавана:й правапарушальні:цы.*

# Дадатак 7

## Узор хадайніцтва аб правядзенні разгляду сітуацыі дзіцяці/сям’і

Горад, дата…………...............................

Раённы суд у.............................

III Аддзел па справах сям’і і непаўналетніх [1]

Арганізацыя, якая падае хадайніцтва:..........................................…

*Прадстаўні:ца:*.............................................

*адрас для карэспандэнцыі*:..........................................…

Удзельні:цы працэсу......................................(імёны бацькоў)

вуліца................................(адрас пражывання)

бацькі непаўналетня:й:............................. (імя дзіцяці, дата нараджэння)

**Хадайніцтва аб правядзенні разгляду сітуацыі дзіцяці/сям’і**

Гэтым прашу правесці разгляд сітуацыі з непаўналетн:яй............................................. (імя дзіцяці, дата нараджэння[2]) і вынясенні адпаведных распараджэнняў у сферы апекі.

**Абгрунтаванне**

Згодна з інфармацыяй, атрыманай ад супрацоўні:ц …………………, якія знаходзяцца ў кантакце з непаўналетн:яй, ……………………………..(апісанне сітуацыі).

Сям’я не знаходзіцца на ўліку па праграме «Сіняя карта».

Улічваючы выкладзеныя абставіны, можна меркаваць, што найлепшыя інтарэсы непаўналетня:й ………………….. знаходзяцца пад пагрозай, а ………………………….. неналежным чынам выконваюць бацькоўскія абавязкі. У сувязі з гэтым падача хадайніцтва аб правядзенні разбіральніцтва па сямейнай сітуацыі непаўналетняй і патэнцыйнай прапанове падтрымкі бацькам з’яўляецца абгрунтаванай.

Супрацоўні:ца арганізацыі, адказная за непаўналетн:юю: ………………… (імя і прозвішча, службовы тэлефон, адрас установы).

.................................... *(подпіс)*

## Дадаткі:

- *Любыя дадатковыя дакументы.*

- Копія заявы.

*[1] Хадайніцтва належыць падаць у суд па месцы жыхарства дзіцяці, а не рэгістрацыі.*
*[2] Імя і адрас дзіцяці прыводзяцца абавязкова. Толькі ў такім выпадку суд можа аказаць дзейсную дапамогу, у тым ліку шляхам накіравання папячыцеля для правядзення размовы з сям'ёй.*

# Дадатак 8

Горад, дата…………..................................

**Заява**

Я, …..................................................................................., пасведчанне асобы №................................., заяўляю, што не бы:ла судзім:ая за злачынствы супраць палавой недатыкальнасці і маральнасці, злачынствы з ужываннем гвалту ў дачыненні да непаўналетня:й, а таксама што ў дачыненні да мяне не вядзецца крымінальная вытворчасць (у тым ліку дасудовае расследаванне) або дысцыплінарны разгляд па вышэйзгаданых падставах.

.....................................................
*подпіс*

# Дадатак 9

## Заява супрацоўні:цы

Я, ніжэйпадпісан:ая ………………………………………….., заяўляю, што азнаёмі:лася са Стандартамі абароны дзяцей ад неналежнага абыходжання, прынятыя ў Асацыяцыі імя Станіслава Бжазоўскага, і абавязваюся іх выконваць.

Подпіс........................................
Месца, дата...................................

# Дадатак 10

## Ацэначны апытальны ліст

| № | Пытанне | Так | Не |
|---|---|---|---|
| 1. | Ці азнаёміліся Вы з дакументам «Стандарты абароны дзяцей ад неналежнага абыходжання ў Асацыяцыі імя Станіслава Бжазоўскага» ? | | |
| 2. | Ці можаце Вы распазнаць праявы неналежнага абыходжання з дзецьмі? | | |
| 3. | Ці ведаеце Вы, як рэагаваць на праявы неналежнага абыходжання з дзецьмі? | | |
| 4. | Ці даводзілася Вам быць сведка:й парушэння прынцыпаў, прадугледжаных Стандартамі абароны дзяцей ад неналежнага абыходжання ў Асацыяцыі імя Станіслава Бжазоўскага, з боку інш:ай супрацоўні:цы? | | |
| 5. | Ці ёсць у вас каментарыі/дапаўненні/прапановы да тэксту Стандартаў абароны дзяцей ад неналежнага абыходжання ў Асацыяцыі імя Станіслава Бжазоўскага? *(напішыце пад табліцай)* | | |

# Дадатак 11

## Прынцыпы бяспечнага найму персаналу

### § 1

### Найм персаналу — асноўныя прынцыпы

1. Галоўнай мэтай падчас найму персаналу арганізацыі з’яўляецца забеспячэнне абароны правоў і бяспекі дзяцей.
2. Найм персаналу на пасады, якія прадугледжваюць кантакт з дзецьмі, суправаджаюцца дбайнай праверкай прафесійнай і этычнай кваліфікацыі суіскальні:цы і я:е досведу працы з дзецьмі.
3. Падчас суразмоўя або іншых мерапрыемстваў па падборы персаналу на пасаду, якая прадугледжвае кантакт з дзецьмі, суіскальні:ца павінная апісаць свой досвед працы з дзецьмі і прадставіць рэкамендацыі з папярэдніх месцаў працы/валанцёрства для праверкі звестак.
4. Заручыўшыся згодай суіскальні:цы, на падставе палажэнняў Рэгламента Еўрапейскага Парламента і Савета Еўрапейскага Саюза 2016/679 ад 27 красавіка 2016 г. аб ахове фізічных асоб пры апрацоўцы персанальных даных і аб свабодным абарачэнні такіх даных, а таксама аб адмене Дырэктывы 95/46/ЕС (Агульны рэгламент аб ахове персанальных даных, Афіцыйны веснік ЕС за 2016 г., № 119, ст. 1 з наступнымі змяненнямі), а таксама Працоўнага кодэкса (Заканадаўчы веснік за 1974 г., № 24, паз. 141 з наступнымі змяненнямі), асоба, адказная за найм персаналу, абавязана звязацца з названымі суіскальні:цай арганізацыямі для пацвярджэння кваліфікацый суіскальні:цы. Вышэйзгаданую згоду належыць атрымаць у дакументальнай форме (напрыклад, у пісьмовай ці электроннай).
5. Адсутнасць згоды, аб якой ідзе гаворка ў п. 4 вышэй, не можа быць самастойнай падставай для адмовы ў працаўладкаванні суіскальні:цы, аднак асоба, адказная за найм, можа на падставе гэтага палічыць прадстаўленыя звесткі аб кваліфікацыі і досведзе непацверджанымі.

### § 2

### Супрацоўніцтва з фізічнымі асобамі, г.зн. асобамі, працаўладкаванымі ў арганізацыі на падставе працоўных або грамадзянска-прававых дагавораў — праверка судзімасці

1. Суіскальні:ца пасады, якая прадугледжвае кантакт з дзецьмі, прадстаўляе пісьмовую заяву, якая ўтрымлівае я:е асабістыя даныя, неабходныя для выканання арганізацыяй абавязацельстваў, прадугледжаных Законам аб супрацьдзеянні здзяйсненню злачынстваў сексуальнага характару і аб абароне непаўналетніх ад 13 мая 2016 года (Заканадаўчы веснік за 2024 г., паз. 560). Узор заявы прыводзіцца ў Дадатку 2 да Стандартаў.
2. Перш чым уступіць у працоўныя адносіны або дапусціць суіскальні:цу да любой іншай дзейнасці, якая прадугледжвае кантакт з дзецьмі, Асацыяцыя правярае, што гэт:ая суіскальні:ца адсутнічае ў Рэестры асоб, якія здзейснілі злачынства

сексуальнага характару. Праверка рэестра пацвярджаецца раздрукоўкай аўтаматычнай выпіскі, згенераванай сістэмай Рэестра.

3. Асоба, даныя якой утрымліваюцца ў Рэестры, не можа быць прынятая на працу ў Асацыяцыю.
4. Асоба, якая прыцягваецца да выканання задач, якія прадугледжваюць кантакт з дзецьмі, абавязана прадставіць даведку з Нацыянальнага рэестра злачынцаў аб адсутнасці звестак пра здзяйсненне злачынстваў, прадугледжаных раздзеламі XIX і XXV, а таксама артыкуламі 189а і 207 Крымінальнага кодэкса ад 6 чэрвеня 1997 года (Заканадаўчы веснік за 2024 г., паз. 17 з наступнымі змяненнямі), Законам аб супрацьдзеянні наркаманіі ад 29 ліпеня 2005 года (Заканадаўчы веснік за 2023 г., паз. 1939 з наступнымі змяненнямі), або адпаведных забароненых дзеянняў, прадугледжаных заканадаўствам іншых краін. Даведка павінна ўтрымліваць звесткі з картатэкі судзімасцей і картатэкі непаўналетніх. Падрабязная інструкцыя па гэтым пытанні прыводзіцца ў Дадатку 5 да Стандартаў.
5. Падчас найму на пасады, якія прадугледжваюць кантакт з дзецьмі, арганізацыя не можа прыняць на працу асобу, якая не прадставіла даведку, названую ў п. 4 вышэй, або прадставіла даведку, з якой вынікае, што яна была асуджана за адно са злачынстваў, згаданых у гэтым пункце.